**УЛАДЗІМЕР АРЛОЎ**

## ЁСЬЦЬ ГАРАДЫ ПРЫДУМАНЫЯ БОГАМ

*ёсьць гарады прыдуманыя Богам*
*ёсьць гарады прыдуманыя д’яблам*
*а хто цябе прыдумаў горад мой?*

*хто сьніў цябе такім якім ніколі*
*ты не прачнесься раніцай туманнай*
*каб у Дзьвіне памыць заспаны твар?*

*што сьнілася табе ў тваіх кашмарах*
*і ў прыцемным бурштынавым бяссоньні*
*і ў сьветлых снах што спавівае сум?*

*хто зь сьвечкай йшоў па гулкіх сутарэньнях*
*палохаючы вусьцішныя цені*
*ўладыкаў звар’яцелых і цароў?*

*хто летапіс твой скраў крывёй паліты*
*хто расьцягнуў тваю бібліятэку*
*зьвёз хто ў чужыну жыватворны крыж?*

*ты прышласьці званіў Сафійскім звонам*
*ты нашым сьніў сябе Ерусалімам*
*ды трэці Рым прызначыў іншы лёс*

*о як мне часам прагнецца ўваскрэснуць*
*у тагасьвеце у які ня веру*
*дзе містыка і тайніцы твае*

*са мной няхай давеку застануцца*
*у вандраваньнях па чысцы і раі*
*а лепш усё ж па пекле: цікавей...*

*я не ўваскрэсну а вось ты — ўваскрэсьнеш!*